**УДК 87/3(Бел.)**

# ПРАБЛЕМА СУАДНОСІН ДЗЯРЖАВЫ І ЦАРКВЫ Ў ТВОРАХ МАЦЕЯ БЕМБУСА

***канд. філас. навук, дац. І.А. БОРТНІК***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*Аб'ектам дадзенага даследавання з'яўляюцца творы езуіцкага тэолага і філасафа канца XVI – пачатку XVII стст. Мацея Бембуса. Прадметам выступаюць ідэі адносна праблемы суадносін дзяржавы і царквы, змешчаныя ў творах М. Бембуса. У выніку праведзенага даследавання былі выяўлены наступныя асноўныя ідэі, якія датычаць вышэйназванай праблемы: ідэя монаканфесійнай дзяржавы, ідэя супрацоўніцтва царкоўнай і дзяржаўнай улады пры забеспячэнні недатыкальнасці правоў каталіцкай царквы, ідэя часовай абмежаванай талеранцыі ў дачыненні іншаверцаў. Ідэя монаканфесійнай дзяржавы абгрунтоўваецца з дапамогай тэалагічнага, палітыка-прагматычнага і прававога аргументаў. Вялікае значэнне ў творах М. Бембуса нададзена пытанням забеспячэння ў дзяржаве канкрэтных правоў каталіцкай царквы. М. Бембус настойвае на неабходнасці дзяржаўнага прымусу ў дачыненні да іншаверцаў, аднак, не закранае пытанне аб выкарыстанні да іх канкрэтных санкцый.*

***Ключавыя словы***: *Варшаўская канфедэрацыя, дзяржава, "ерась", езуіты, каталіцызм, Контррэфармацыя, Рэч Паспалітая, талеранцыя, царква.*

У грамадска-палітычнай думцы Вялікага Княства Літоўскага ў апошняй трэці XVI – першай палове XVII стст. адзін з найбольш уплывовых накірункаў быў прадстаўлены творчасцю езуіцкіх інтэлектуалаў. Адным з прадстаўнікоў езуіцкай думкі Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства першай паловы XVII ст. з'яўляўся Мацей Бембус (1567-1645). Ён нарадзіўся ў Познані; у 1587 г. уступіў у ордэн езуітаў. У канцы XVI – пачатку XVII стст. М. Бембус выкладаў філасофію і тэалогію ў езуіцкіх калегіумах Польшчы. У 1601–1612 гг. ён працаваў у Віленскай езуіцкай акадэміі, дзе выкладаў філасофію і тэалогію. У 1612–1618 гг., пасля смерці П. Скаргі, М. Бембус займаў пасаду прапаведніка караля Жыгімонта III Вазы. У далейшым ён працаваў у розных езуіцкіх навучальных установах Польшчы, у тым ліку быў рэктарам езуіцкага калегіума ў Познані (1621–1623), з'яўляўся дарадцам польскіх правінцыялаў, актыўна ўдзельнічаў у рэлігійным і грамадскім жыцці ордэна, у 1625 г. некалькі месяцаў выконваў функцыі віцэ-правінцыяла Польскай правінцыі ордэна езуітаў [1, s. 419–420]. Мацей Бембус яшчэ падчас працы ў Віленскай акадэміі зарэкамендаваў сябе як таленавіты рэлігійны прапаведнік, хаця сваіх казанняў друкам не выдаваў [1, s. 420]. У пазнейшы перыяд сваёй дзейнасці ён пакінуў значную колькасць надрукаваных твораў тэалагічнага, рэлігійна-палемічнага, рэлігійна-этычнага і грамадска-палітычнага зместу.

Аб'ектам дадзенага даследавання з'яўляюцца творы М. Бембуса, у якіх прадстаўлена праблематыка суадносін дзяржаўнай і царкоўнай улады: "Мір, які не з'яўляецца мірам…" ("Pax non pax...", Кракаў, 1615; перавыдадзены ў перакладзе на польскую мову ў анталогіі „Filozofia i myśl społeczna" [2]), "Камета, тое ёсць пагроза з неба" (Kometa, to jest pogróżka z nieba", 1619). Першая з гэтых прац уяўляе з сябе палемічны твор, скіраваны супраць пратэстантаў у якасці адказу на праект некаторых пратэстанцкіх дзеячоў 1613 г. аб пагадненні з каталіцкай царквой. Другая праца ўключае ў сябе разважанні з нагоды з'яўлення на небе каметы, што лічылася знакам магчымых боскіх кар. Гэтыя разважанні ў сваю чаргу выступілі стымулам для разгляду шэрагу сацыяльных праблем Рэчы Паспалітай.

Прадметам дадзенага даследавання выступаюць ідэі адносна праблемы суадносін дзяржавы і царквы, якія змяшчаюцца ў названых творах М. Бембуса. Адпаведна, мэта прадстаўленай працы – выяўленне і аналіз асноўных ідэй адносна ўзгаданай праблематыкі ў творчасці Мацея Бембуса.

Праблематыка твораў М. Бембуса да гэтага часу не станавілася прадметам грунтоўнага навуковага аналізу. Асобныя яе элементы разглядаліся ў працах польскіх навукоўцаў, прысвечаных жыццю і дзейнасці езуіцкага інтэлектуала [3]. Погляды М. Бембуса як прыклад рэлігійнай нецярпімасці каротка ўзгадваюцца ў працах польскіх даследчыкаў З. Аганоўскага і У. Аўгустыняк [4, s. 118; 6, s. 58].

Праблема суадносін дзяржавы і царквы ў грамадстве вырашалася М. Бембусам ў рэчышчы контррэфармацыйнай ідэі монаканфесійнай дзяржавы. У гэтай сувязі вострай крытыцы падлягаў акт Варшаўскай канфедэрацыі, які забяспечваў свабоду веравызнання сярод шляхты ў Рэчы Паспалітай.

Ідэя монаканфесійнай дзяржавы абапіралася на некалькі аргументаў. Першым сярод іх выступае тэалагічны аргумент. Паводле яго, "ерась", пад якой разумеецца адыход ад каталіцкай артадоксіі ў форме розных пострэфармацыйных вучэнняў, разглядаецца як найцяжэйшы грэх, як "bluznienie wiary świętey

Chrześciańskiey Katholickiey”, “duchowe cudzolostwo y bałwochwalstwo” [6, s. 21–22][1]. Свабода веравызнання, на думку М. Бембуса, дае прастор для з’яўлення розных вучэнняў, якія ўтрымліваюць у сабе зняваѓу Бога [2, s. 465–466]. Падкрэсліваецца прынцыповы антаганізм каталіцызму і “ерасяў”; спробы іх прымірэння ацэньваюцца як спробы “pojednać diabła z Chrystusem” [2, s. 461][2]. У гэтай сувязі можна вылучыць паралелі з ідэяй іншага выбітнага езуіцкага інтэлектуала П. Скаргі аб тым, што цярпімасць аднosна “ератыкоў”, што забіваюць душы, раўназначная з цярпімасцю да забойцаў [7, k. 6–7]. Разам з “ератыкамі” М. Бембус востра крытыкуе так званых “палітыкаў”, пад якімі меліся на ўвазе каталікі, што талерантна ставіліся да іншаверцаў і імкнуліся да рэлігійнага міру, абвінавачваючы іх у рэлігійным індыферэнтызме [6, s. 35]. Прымірэнне з “ератыкамі”, на яго думку, магчымае толькі пры ўмове пакаяння і навяртання ў каталіцызм апошніх.

Некалькі інакшае стаўленне ў М. Бембуса да праваслаўя, якое, паводле яго, гістарычна ўзыходзіць да апостальскай традыцыі. Пры гэтым М. Бембус прызнаваў толькі манархічную мадэль хрысціянскай царквы на чале з рымскім папам як пераемнікам апостала Пятра [8, k. 12]. Таму непадпарадкаванне праваслаўнай царквы рымскаму папе і наяўнасць спецыфічных элементаў у яе веравучэнні і кульце, якія не адпавядаюць канонам каталіцызму, разглядаюцца як “схізма”. Неабходна мець на ўвазе тое, што творчасць М. Бембуса прыходзілася на час вострых рэлігійных канфліктаў у Рэчы Паспалітай, выкліканых Брэсцкай царкоўнай уніяй. У творы “Камета” “грэцкая схізма” і нежаданне праваслаўных прызнаваць унію з каталіцкай царквой разглядаюцца як адна з важнейшых негатыўных з’яў (“грахоў”) у Рэчы Паспалітай [6, s. 23–24]. М. Бембус актыўна выступаў у падтрымку ўніяцкай царквы (асабіста прымаў удзел у сінодзе уніяцкай царквы ў Львове ў 1629), бачачы ў ёй сродак выпраўлення “памылак” праваслаўнай царквы і забеспячэння дагматычнага і арганізацыйнага адзінства пры захаванні спецыфічных абрадаў, цырымоній і мовы набажэнства для асобных цэркваў. У сваім познім творы “Заклік да каталіцкага адзінства” („Wzywanie do jedności katolickiej”, Кракаў, 1629) ён заклікаў праваслаўных Рэчы Паспалітай да прыняцця “новай уніі” з каталіцкай царквой. Асаблівы націск аўтар надаваў ілюстрацыі працяглай традыцыі падпарадкавання ўсходніх цэркваў Рыму, Фларэнтыйскай уніі 1439 г., якая была ўхвалена ў тым ліку і праваслаўным духавенствам Польшчы і ВКЛ [8, k. 16–17]. У цэлым М. Бембус звяртаецца да праваслаўных ў даволі лагодным тоне, пазбягае інвектыў, што можна патлумачыць надзеямі на перамогу ўніяністцкіх тэндэнцый ў межах праваслаўнай царквы.

М. Бембус выкарыстоўвае таксама ў сваіх творах палітыка-прагматычны аргумент на карысць ідэі монаканфесійнай дзяржавы. Сутнасць яго палягае ў разуменні рэлігійнага адзінства як важнейшага фактару грамадскай стабільнасці. Дадзены аргумент абгрунтоўваецца спасылкамі не толькі на хрысціянскіх, але і на антычных мысліцеляў, у якіх знаходзяцца сцвярджэнні наступнага кшталту: “Wyznawanie jednej i tej samej nauki o Bogu, nieróżnienie się wzajemnie sposobem życia i obyczajami mogą zapełnic najlepszą zgodę ku ogólnemu pożytkowi” [2, s. 463][3]. Сярод аўтарытэтаў у гэтай справе ўзгадваецца таксама знакаміты і папулярны ў грамадскай думцы Рэчы Паспалітай нідэрландскі філосаф канца XVI – пачатку XVII стст. Юст Ліпсій [2, s. 462]. Згодна з разважаннямі М. Бембуса, панаванне ў дзяржаве аднаго рэлігійнага веравызнання – цалкам разумная і нармальная з’ява, у той час як шматканфесійнасць указвае на ненармальны стан, што становіцца крыніцай сацыяльных канфліктаў, у тым ліку ва ўзброенай форме: “Z różnic w poglądach religijnych pozostają i czerpią pożywkę waśnie między ludźmi” [2, s. 464][4]. Дадзеныя погляды асвячаліся таксама аўтарытэтам польскіх каралёў Ягайлы і Жыгімонта І Старога [2, s. 463]. Грамадзянскія войны ў Францыі ў другой палове XVI ст., а таксама рэлігійна-палітычныя канфлікты ў Англіі ў сярэдзіне XVI ст. вынікалі, у адпаведнасці з падобнымі разважаннямі, з наяўнасці ў грамадстве розных рэлігійных груп [2, s. 463].

Палітыка-прагматычны аргумент карыстаўся папулярнасцю ў межах контррэфармацыйнай думкі; у прыватнасці, ён сустракаецца ў творах П. Скаргі і Ф. Біркоўскага [7, k. 15; 9, s. 9–10]. У той жа самы час у пратэстанцкай літаратуры міжканфесійны мір абвяшчаецца крыніцай грамадскай згоды, а менавіта рэлігійная нецярпімасць – крыніцай сацыяльных канфліктаў; віна за рэлігійныя войны ў заходнееўрапейскіх краінах ускладаецца на неталерантных дзеячоў каталіцкай царквы, перадусім езуітаў [10, k. 31–32, 36–43; 11, s. 282–283; 12, s. 355–357; 13, s. 219–225, 239–240; 14, s. 156].

---

[1]“знявага святой хрысціянскай каталіцкай веры”, “духоўнае пралюбадзейства і ідалапаклонніцтва” (пер. аўт.).

[2]„злучыць д’ябла з Хрыстом” (пер. аўт.).

[3]“З адрозненняў у рэлігійных поглядах вынікаюць жыццёвыя разлады паміж людзьмі. Людзі, якія прытрымліваюцца розных веравызнанняў, не могуць заключыць паміж сабой трывалага і сапраўднага міру” (пер. аўт.).

[4] “З рэлігійных адрозненняў вынікаюць і абвастраюцца сваркі паміж людзьмі” (пер. аўт.). Пра тое ж размова на S. 468–469.

Крытыка Варшаўскай канфедэрацыі ў М. Бембуса абапіраецца таксама на прававы аргумент, згодна з якім узгаданы дакумент нельга лічыць сапраўдным заканадаўчым актам Рэчы Паспалітай, таму што ён не быў ухвалены аднагалосна ўсімі станамі, уключаючы каталіцкае духавенства [2, s. 467]. Дадзены аргумент таксама займаў шырокае месца ў творах каталіцкіх, асабліва езуіцкіх, ідэолагаў.

Выкарыстанне ўзгаданых традыцыйных у каталіцкай думцы аргументаў супраць рэлігійнай талеранцыі спалучаецца з распаўсюджанымі ў контррэфармацыйнай літаратуры абвінавачваннямі “ератыкоў” у крывадушшы, што праяўляецца ў інструментальным разуменні феномена талеранцыі. М. Бембус адзначае жорсткі ўціск, якому падлягаюць каталікі ў тых дзяржавах (Англія, Галандыя, Саксонія), дзе ўлада знаходзіцца ў руках пратэстантаў. Таксама ён выяўляе супярэчнасць паміж дэклареумай пратэстантамі Рэчы Паспалітай свабодай веравызнання і адмаўленнем рэлігійнай талеранцыі ў творчай спадчыне аўтарытэтнага швейцарскага рэфарматара-кальвініста Тэадора Безы, адпаведная цытата якога прыведзена ў творы “Мір, які не з’яўляецца мірам” [2, s. 468–469]. Дадзеныя з’явы знайшлі адлюстраванне і адпаведную інтэрпрэтацыю таксама ў шматлікіх творах рымска-каталіцкіх і ўніяцкіх мысліцеляў [15, с. 147; 16, s. 397; 17, s. 363, 366; 18, s. 10, 13–14; 19, s. 140–143].

Адмаўленне свабоды веравызнання спалучаецца ў творчасці М. Бембуса з пастуліраваннем неабходнасці цеснага супрацоўніцтва дзяржаўнай і царкоўнай улады. Галоўная функцыя царквы – гэта духоўнае выхаванне вернікаў у накірунку дасягнення “вечнага выратавання”, а таксама навяртанне ў “ісцінную веру” тых, хто знаходзіцца па-за межамі каталіцкай царквы, і духоўная абарона ад “ерасяў”. Абавязкам дзяржаўнай улады абвяшчаецца “strzeżenie praw Kościoła oraz zwalczanie jego nieprzyjaciół i wrogów, naruszających jego spokój i rozbijających jego jedność” [2, s. 471].[5].

Сцвярджэнне абавязку дзяржаўнай улады выкарыстоўваць уласцівыя ёй механізмы для забеспячэння пануючага статусу каталіцкай царквы вынікае з пашыранай у каталіцкім свеце ў Сярэднявеччы тэорыі “двух мячоў”. Розныя каталіцкія мысліцелі позняга Сярэднявечча і ранняга Новага часу, разважаючы аб адносінах да дзяржаўнай улады, якая не выконвае свае функцыі перад царквой, рабілі з гэтай тэорыі высновы аб праве царкоўнай улады на арганізацыю грамадскага непадпарадкавання і змяшчэнне з пасад дзяржаўных кіраўнікоў у выпадку разыходжання спосабу іх праўлення з патрабаваннямі боскага і натуральнага права. Дадзеныя ідэі набылі актуальнасць ва ўмовах Контррэфармацыі для абгрунтавання барацьбы з тымі дзяржаўнымі ўладамі, якія адыходзілі ад каталіцкай царквы. У контррэфармацыйнай думцы Вялікага Княства Літоўскага і Польскага Каралеўства падобныя ідэі знайшлі ўвасабленне ў розных варыянтах канцэпцыі “капланскага каралеўства”, змешчанай у творах С. Ажахоўскага, С. Гозія П. Скаргі, Я. Вуйка і іншых мысліцеляў [17, s. 105; 20, k. 47; 21, s. 83–84, 96–97, 111; 22, s. 213–214].

М. Бембус не выбудоўвае тэарэтычнай канцэпцыі суадносін царкоўнай і дзяржаўнай улады. Большая ўвага ў яго творах нададзена канкрэтным правам каталіцкай царквы, якія павінны быць забяспечаны ў дзяржаве. Сярод іх узгадваюцца недатыкальнасць культавых пабудоў (касцёлаў і кляштароў) і царкоўнай маёмасці, у тым ліку зямельнай, а таксама недапушчальнасць іх выкарыстання ў свецкіх мэтах, права царквы на атрыманне дзесяціны, падаткова імунітэт царквы, права на ажыццяўленне царкоўнага суду і выкананне яго рашэнняў дзяржаўнымі органамі ўлады, права царквы і кляштароў на набыццё зямельнай маёмасці [2, s. 466; 6, s. 24–29]. Правы каталіцкай царквы, на думку М. Бембуса, парушаліся ў выніку захопу прадстаўнікамі шляхты пострэфармацыйных канфесій культавых будынкаў і іншай царкоўнай маёмасці ў сваіх уладаннях, адмовы імі ў выплаце царкоўных дзесяцін, скасавання абавязку выканання органамі дзяржаўнай улады рашэнняў царкоўных судоў у справах “ерасі” і г.д. Неабходна адзначыць, што ў другой палове XVI – першай трэці XVII стст. праблема *compositio inter status*, звязаная з вызначэннем правоў каталіцкай царквы і звязаных з імі адносін паміж шляхтай і каталіцкім духавенствам у шляхецкіх маёнтках, была прадметам шырокіх дыскусій як на пасяджэннях соймаў, так і ў сацыяльна-палітычнай літаратуры Рэчы Паспалітай [4, s. 29-93, 99–121]. М. Бембус, як і шматлікія іншыя прадстаўнікі контррэфармацыйнай думкі, супрацьпастаўляў легітымныя правы каталіцкай царквы, якія пастаянна парушаліся пасля Рэфармацыі, нелегітымным, на яго думку, правам пострэфармацыйных канфесій, што вынікалі з акту Варшаўскай канфедэрацыі [2, s. 466–467].

Заслугоўвае на ўвагу таксама пытанне канкрэтных мерапрыемстваў па барацьбе з “ерасямі”, пра якое шмат гаворыцца ў творах М. Бембуса. Ён падкрэслівае недапушчальнасць беспакараннага стаўлення да праяў “ерасі” і “блюзнерства”, якія нясуць з сабой пагрозу для грамадскага спакою [2, s. 464–465]. Падобныя заявы былі ў цэлым уласцівыя для контррэфармацыйнай думкі. У той жа час канкрэтны змест таго, што разумелася пад барацьбой з “ерасямі”, нярэдка быў розным у залежнасці ад падыходу таго ці іншага аўтара, а таксама ад асаблівасцяў сацыяльна-палітычнай сітуацыі, ва ўмовах якой ствараўся той ці

[5] „абарона правоў царквы і барацьба з яе непрыяцелямі і ворагамі, што парушаюць яе спакой і падрываюць яе адзінства” (пер. аўт.).

іншы твор. Гэта датычыць і контррэфармацыйнай думкі ў Рэчы Паспалітай, нягледзячы на тое, што ў цэлым тут сацыяльна-палітычныя ўмовы спрыялі актуалізацыі дастаткова мяккіх падыходаў ў справе рэлігійнай інталеранцыі. Так, напрыклад, П. Скарга ў працы "Засцеражэнне да каталікоў аб паводзінах з ератыкамі" найбліжэйшымі задачамі ў барацьбе з іншаверствам лічыць неабходнасць выдалення пратэстантаў з каралеўскіх гарадоў і рэстытуцыі захопленай шляхтай падчас Рэфармацыі маёмасці каталіцкай царквы [18, к. 32]. Што датычыць творчасці М. Бембуса і найперш яго твору "Мір, які не з'яўляецца мірам", дзе закранаецца ўзгаданая праблематыка, ніякай канкрэтыкі ў справе дэклараванай неабходнасці пакарання "ератыкоў" няма. У кантэксце крытыкі Варшаўскай канфедэрацыі можна звярнуць увагу на наступную фразу: "Wyznawajcie, co chciecie, nie przeszkadzamy; nie dręczymy was karami, ale nie naruszajcie i nie tykajcie naszych praw. Powsztrzymywajcie wasze oczy i uszy od naszych spraw. W przeciwnym razie chciecie nie pokoju z nami, ale bezkarnego naruszania naszych praw (...)" [2, s. 467][6]. З гэтай фразы вынікае, што езуіцкі ідэолаг быў вымушаны лічыцца з фактам шматканфесійнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай, а таму барацьба з "ерасямі" ў яго словах рэінтэрпрэтуецца ў барацьбу за захаванне правоў каталіцкай царквы ад парушэнняў з боку "ератыкоў", што азначала па сутнасці згоду на дапушчальнасць абмежаванай рэлігійнай талеранцыі. Можна пагадзіцца з думкай У. Аўгустыняк, якая вылучыла ў поглядах М. Бембуса прызнанне часовай талеранцыі як неабходнага зла (...)"[4, s. 118][7].

Такім чынам, аналіз творчасці Мацея Бембуса дазволіў выявіць у яе межах наступныя асноўныя ідэі паводле праблемы суадносін дзяржавы і царквы: ідэя монаканфесійнай дзяржавы, ідэя супрацоўніцтва духоўнай і дзяржаўнай улады пры забеспячэнні недатыкальнасці правоў каталіцкай царквы, ідэя часовай абмежаванай талеранцыі ў дачыненні да іншаверцаў.

ЛІТАРАТУРА

1. Bednarski, S. Bembus Mateusz / S. Bednarski // Polski Słownik Biograficzny. – T. 1, z. 2–5 / [kom. red. W. Konopczyński (red. główny) et al.]. – Warszawa : PAU, 1935. – S. 419–420.
2. Bembus, M. Pokój, któpy nie jest pokojem / M. Bembus // Filozofia i mysl społeczna XVII wieku: 700 lat myśli polskiej / wybrał, oprac., wstępem i przypisami opatrzył Z. Ogonowski. – Warszawa, 1979. – Cz. 1. – S. 459–472.
3. Darowski, R. Mateusz Bembus SJ (1567–1645), profesor filozofii w Poznaniu / R. Darowski // Archiwum filozofii i myśli społecznej. – T. 31. – Wrocław, 1985. – S. 213–228.
4. Augustyniak, U. Państwo świeckie czy księże? Spór o rolę duchowieństwa katolickiego w Rzeczypospolitej w czasach Zygmunta III Wazy : wybór tekstów / U. Augustyniak. – Warszawa : Semper, 2013. – 688 s.
5. Ogonowski, Z. Z zagadnień tolerancji w Polsce XVII wieku / Z. Ogonowski. – Warszawa : PWN, 1958. – 349 s.
6. Bembus, M. Kometa to iest pogrożka z nieba na postrach, przestrogę, y upomnienie ludzkie, pokazana w roku [...] / M. Bembus. – Kraków : A. Piotrkowczyk, 1619. – 54 s.
7. Skarga, P. Proces konfoederatiey / P. Skarga. – Kraków : A. Piotrkowczyk, 1595. – 20 k.
8. Bembus, M. Wzywanie do iedności katholickiey narodu ruskiego, religiey graeckiey z Kościołem rzymskim [...] / M. Bembus. – Kraków : A. Piotrkowczyk, 1629. – 26 k.
9. Birkowski F. Kwiat opadający abo Nagrobk Gustawa Adolfa, króla szwedskiego / F. Birkowski // Mowy pogrzebowe i przygodne : w 2 cz. / F. Birkowski ; z portr., oraz z krytyczna oceną mówcy przez ks. A. Szlagowskiego. – Warszawa : Księgarnia Gebethnera i Wolfa, 1901. – Cz. 2. – 262 s.
10. Niemojewski, J. Apologia to jest dowody i obrona konfesjej kościołów polskich / J. Niemojewski. – Kraków : M. Wierżbięta, 1572. – 773 s.
11. Obrona przeciw procesowi konfederacyjej teraz pod sejmem krakowskim wydanemu, w której jest jasne okazanie, że ewanjelicy konfederacyjej się upominając nie żadnej inszej rzeczy żądają i pragną, jedno samego pokoju. – [Kraków]. [Maciej Wierzbięta]. [1595] // Korolko, M. Klejnot swobodnego sumienia. Polemika wokół Konfederacji Warszawskiej w latach 1573–1658 / M Korolko. – Warszawa : PAX, 1974. – S. 260–292.
12. Oliwka pokój niosąca posłana do jaśnie wielmożnego pana Adama Gorajskiego z Goraja od pewnego przyjaciela I. C. M. 1597 // Korolko, M. Klejnot swobodnego sumienia. Polemika wokół Konfederacji Warszawskiej w latach 1573–1658 / M. Korolko. – Warszawa : PAX, 1974. – S. 334–358.
13. Respons w porywczą dany na Upominanie do ewangelików o zburzeniu zboru Krakowskiego i na Przestrogę do katolików od kogoś uczynioną w roku 1592. [Toruń]. [Andrzej Cotenius] // Korolko, M. Klejnot swobodnego sumienia. Polemika wokół Konfederacji Warszawskiej w latach 1573-1658 / M. Korolko. – Warszawa : PAX, 1974. – S. 216–259.
14. Zbiór wileński ewanielicki, przez rzymskie katoliki burzony, mordowany, palony // Kosman, M. Protestanci i kontrreformacja. Z dziejów tolerancji Rzeczypospolitej XVI-XVII wieku. – Wrocław-Warszawa-Kraków-Gdańsk : PAN, 1978. – S. 145–162.

---

[6] "Вызнавайце тое, што хочаце, не перашкаджаем; мы вас не прыгнятаем, але і вы не парушайце і чапайце нашыя правы. Устрымлівайце свае вочы і вушы ад нашых спраў. У адваротным выпадку атрымліваецца, што вы не міру з намі хочаце, але беспакараннага парушэння нашых правоў" (пер. аўт.).

[7] Augustyniak, U. Państwo świeckie czy księże. – S. 118.

15. Унія греков с костёлом Римским 1595 года // Русская историческая библиотека, издаваемая Постоянной исторической археографической комиссией Российской Академии Наук (АН СССР): в 39 т. – СПб., 1872–1927. – Т. 7 : Памятники полемической литературы в Западной Руси. Кн. 2 / под ред. П. Гильтебрандта. – СПб. : Тип. А.М. Котомина и К°, 1882. – С. 111–168.
16. Deklaracyja nowego prawa konfederacyjej // Korolko, M. Klejnot swobodnego sumienia. Polemika wokół Konfederacji Warszawskiej w latach 1573–1658 / M. Korolko. – Warszawa : PAX, 1974. – S. 388–398.
17. Skarga, P. Kazania sejmowe / P. Skarga // Piśma wszystkie : w 4 t. / P. Skarga. – Warszawa : Dr. R. Kaniewskiego, 1923–1926. – T. 2 : Kazania sejmowe. Wyzwanie do pokuty obzwatelów Korony Polskiej y Wielkiego Księstwa Litewskiego. – 1924. – S. 2–107.
18. Skarga, P. Upominanie do ewangelików y do wszystkich społem nie katholików, iż o skażenie zborów Krakowskich gniewać się y nic nowego y burzliwego zaczynać nie maią / P. Skarga. – Poznań : B. Wolrobowa i dziedzice, 1592. – 88 s.
19. Skarga, P. Wzywanie do pokuty obzwatelów Korony Polskiej y Wielkiego Księstwa Litewskiego / P. Skarga // P. Kazania sejmowe / P. Skarga // Piśma wszystkie: w 4 t. / P.Skarga. – Warszawa: Dr. R. Kaniewskiego, 1923–1926. – T. 2 : Kazania sejmowe. Wzywanie do pokuty obzwatelów Korony Polskiej y Wielkiego Księstwa Litewskiego. – 1924. – S. 108–147.
20. Hosius, S. Ksyęgi o jasnym a szczyrym słowie Bożym (...) Sygmuntowi Augustowi (...) przypisane / S. Hosius. – Kraków : L. Andrusowic, 1562. – [4], [147] k.
21. Orzechowski, S. Quincunx, to jest wzór Korony Polskiej na cynku wystawiony / S. Orzechowski ; wyd. K.J. Turowskiego. – Warszawa : Wyd-wo Biblioteki Polskiej, 1858. – 113 s.
22. Wujek, J. O kościele Pana Chrystusowym prawdziwym rozprawa stateczna a dowodna z odpowiedzią na dowody przeciwne pana Jakuba Niemoiewskiego / napisana przez professory w Collegium Poznańskim Societas Iesu (…) / J. Wujek. – Poznań : Jan Worlab, 1580. – 206 s.

*Поступила 28.04.2017*

## THE PROBLEM OF STATE AND CHURCH CORRELATION AS REFLECTED IN THE WORKS OF MATEUSZ BEMBUS

***I. BORTNIK***

*The object of the research is the works of the Jesuit theologist and philosopher Mateusz Bembus, who lived at the end of XVI – the beginning of XVII. The subject of the research is the ideas about state and church correlation in the works of Mateusz Bembus. As a result of the conducted research the following main Bembus's ideas on state and church correlation were identified: the idea of monoconfessional state, the idea of spiritual and state power collaboration and at the same time guaranteeing right immunity for the Catholic Church, the idea of temporary and limited tolerance towards adherents of different creed. The idea of monoconfessional state is grounded with the help of the following three arguments: theological, political and pragmatic, legal. The issues of guaranteeing rights for the Catholic Church take a significant space in the works of Bembus. Bembus insists on the importance of state compulsion on adherents of different creed, but he never touches upon the aspect of laying specific sanctions over them.*

***Keywords**: The Warsaw Confederation, state, "heresy", Jesuits, Catholicism, Counter-Reformation, the Polish–Lithuanian Commonwealth, tolerance, church.*